**СПОСАБЫ ЎТВАРЭННЯ НЕАЛАГІЗМАЎ
У МОВЕ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПУБЛІЦЫСТЫКІ**

**Аўчыннікава Маргарыта (УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, Беларусь)
Навуковы кіраўнік – А. В. Солахаў, канд. філал. навук, дацэнт**

Даследаванне сучасных беларускіх публіцыстычных тэкстаў паказвае, што ў мове ідзе заканамерны і гістарычна абумоўлены працэс утварэння новых слоў. Літаральна ў кожнай беларускай газеце можна знайсці слова, якое не фіксуецца ў слоўніках, а ўтворана аўтарам газетнага артыкула.

Мэта артыкула – выявіць неалагізмы ў мове сучасных беларускіх газет і апісаць спосабы іх словаўтварэння.

Метадалагічнай асновай даследавання паслужыла манаграфія А. В. Солахава і Б. А. Крука «Наватворы ў мове беларускай публіцыстыкі пачатку XXI ст.» [1].

Аналіз мовы газет «Звязда», «Краязнаўчая газета», «Настаўніцкая газета» за студзень – сакавік 2023 г. сведчыць аб тым, што словаўтваральны працэс у беларускай публіцыстыцы ідзе даволі актыўна. Пры ўтварэнні неалагізмаў адзначаюцца наступныя спосабы словаўтварэння:

1) **суфіксацыя**: ***распальвальнік*** 'той, хто распальвае, развязвае што-небудзь': *Прадстаўнік кітайскага знешнепалітычнага ведамства Ван Вэньбінь апраўдана назваў ЗША найбуйнейшым* ***распальвальнікам*** *канфліктаў у свеце, паведаміла ТАСС* (Звязда. 2023. 25 лютага. С. 11); ***валанцёрыць*** 'быць валанцёрам': ***валанцёрыць*** *– гэта крута* (Краязнаўчая газета. 2023. Студзень. № 11. С. 7); ***лайкаць*** 'ставіць лайкі': *Людзі пішуць, посцяць,* ***лайкаюць,*** *спрачаюцца – і ўсё гэта выносяць «на людзі»* (Звязда. 2023. 19 студзеня. С. 2);

2) **прэфіксацыя**: ***антырэйтынг*** 'тое, што супрацьлеглае рэйтынгу': *Як вынік – нізкая нараджальнасць, высокая смяротнасць і адток насельніцтва паставілі колішніх "балтыйскіх тыграў" на вяршыню глабальнага* ***антырэйтынгу*** *нацый, схільных да рызыкі вымірання* (Звязда. 2023. 19 студзеня. С. 4); ***дэпапуляцыя*** 'знішчэнне папуляцыі': *...працэсы* ***дэпапуляцыі*** *ва Усходняй Еўропе, якія назіраюцца, не маюць аналагаў у сусветнай гісторыі* (Звязда. 2023. 19 студзеня. С. 4);

3) **прэфіксацыя + суфіксацыя**: ***беспрывязны*** 'які знаходзіцца не на прывязі': *Да жніўня мінулага года старая ферма тут была пераабсталяваная пад* ***беспрывязнае*** *ўтрыманне* (Звязда. 2023. 25 лютага. С. 7); ***суперпрэміяльны*** 'які заслугоўвае самай высокай прэміі': *Гэты каштоўны дэлікатэс заслугоўвае права называцца* ***суперпрэміяльным*** *прадуктам* (Звязда. 2023. 25 лютага. С. 3); ***супрацькашлевы*** 'які прымяняецца супраць кашлю': *Першая група –* ***супрацькашлевыя*** *сродкі, якія яго прыбіраюць* (Звязда. 2023. 1 сакавіка. С. 12);

4) **асноваскладанне**: ***слабаадмоўны*** 'пры слабых адмоўных паказчыках (пра тэмпературу)', ***слабададатны*** 'пры слабых дадатных паказчыках

МГПУ им. И. П. Шамякина

(пра тэмпературу)’: *Пры гэтым тэмпературны фон панізіцца і ў начныя гадзіны будзе знаходзіцца ў межах адмоўных значэнняў, а днём – вагацца ад **слабаадмоўных** да **слабададатных** значэнняў* (Звязда. 2023. 24 лютага. С. 3); ***сярэднетэрміновы*** ‘тэрміновы сярэдняга ўзроўню’: *Міжведамаснай рабочай групай ужо выпрацаваны комплексныя прапановы для фарміравання мерапрыемстваў на гэты год, у тым ліку першачарговых і **сярэднетэрміновых*** (Звязда. 2023. 25 лютага. С. 2);

4) **апакопа + асновасловаскладанне**: ***аградрон*** ‘дрон, прызначаны для выканання аграрных работ’: *Беларускія **аградроны** ўжо працуюць у сельскай гаспадарцы* (Звязда. 2023. 25 лютага. С. 5); ***велапаркоўка*** ‘паркоўка веласіпедаў’: *Унутраны двор закрыты – тут размесцяцца дзіцячыя пляцоўкі і **велапаркоўка*** (Звязда. 2023. 24 лютага. С. 4); ***дзяржструктура*** ‘дзяржаўная структура’: *Пасля заканчэння ВНУ воін-інтэрнацыяналіст і ліквідатар наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС больш за 20 гадоў працаваў па набытай прафесіі ў розных **дзяржструктурах*** (Звязда. 2023. 15 лютага. С. 4); ***інвестпраграма*** ‘інвестыцыйная праграма’: *Калі ж рабіць гэта праз **інвестпраграму**, то на чале такога праекта будзе нейкае буйное прадпрыемства…* (Звязда. 2023. 15 лютага. С. 8); ***экапарк*** ‘экалагічны парк’: *Па даразе ў Станькава, дзе і **экапарк**, і графская сядзіба, заехаць у Літавец – лясную спаленую фашыстамі вёску…* (Звязда. 2023. 24 лютага. С. 13); ***электрадом*** ‘дом з электрычным ацяпленнем’: *Новым месцам жыхарства маладых спецыялістаў цяпер будзе сучасны **электрадом*** (Настаўніцкая газета. 2023. 10 лютага. С. 6);

6) **словаскладанне**: ***анлайн-аўдыторыя*** ‘аўдыторыя сеткі Інтэрнэт’: *Навучэнцам прапануецца зрабіць абгрунтаваны выбар найбольш эфектыўных шляхоў і спосабаў аховы навакольнага асяроддзя і падзяліцца з **анлайн-аўдыторыяй** практычнымі ідэямі беражлівага стаўлення да прыроды* (Настаўніцкая газета. 2023. 10 лютага. С. 12); **прэс-тур** ‘тур, паездка куды-небудзь работнікаў прэсы’: *У першы дзень **прэс-туру** мы азнаёміліся з сістэмай адукацыі Кобрыншчыны* (Настаўніцкая. 2023. 10 лютага. С. 4); ***тата-школы*** ‘школа, у якой вучаць выконваць абавязкі таты’: *За гэты час «**тата-школы**» выйшлі далёка за межы сталіцы, а праект набыў пэўныя кірункі дзейнасці* (Звязда. 2023. 19 студзеня. С. 6); ***фільм-расследаванне*** ‘фільм, які паказвае расследаванне якога-небудзь злачынства’: *Мы заказалі ў іх дакументальны цыкл **фільмаў-расследаванняў** «Канвеер смерці» пра генацыд нашага народа ў гады мінулай вайны (*Звязда. 2023. 25 лютага. С. 11);

7) **зрашчэнне**: **штосераду** ‘кожную сераду’: *Цяпер **штосераду** раніцай, перад тым як паехаць на працу, выстаўляем завязаныя пакеты са смеццем за веснічкі* (Звязда. 2023. 25 лютага. С. 9);

8) **літарна-гукавая абрэвіяцыя**: **ДКНП** (дэ-ка-ніі) ‘Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях’: *Такая сума будзе не зусім бесперспектыўнай у частцы інавацыйнага фонду **Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхна-***

МГПУ им. И. П. Шамякина

***логіях*** (Звязда. 2023. 15 лютага. С. 8); ***НЦЭП*** (эн-цэп) ‘Нацыянальны цэнтр электронных паслуг’: *Пра новаўвядзенні сістэмы як прадукту ... расказаў Дзяніс САКРАТАРОЎ, вядучы спецыяліст аддзела электроннай камерцыі* ***НЦЭП*** (Звязда. 2023. 25 лютага. С. 2);

9) **дэсуфіксацыя** + **асновасловаскладанне**: ***ВаенТБ*** ‘ваеннае тэлебачанне’: *Сёння можна адзначыць, напрыклад, большае, чым раней узаемадзеянне з беларускім* ***ВаенТБ****, у тандэме мы сталі больш расказваць, чым жыве наша армія* (Звязда. 2023. 25 лютага. С. 11).

Такім чынам, аналіз неалагізмаў у мове беларускай публіцыстыкі апошняга часу сведчыць, што яны ўтвараюцца рознымі спосабамі. Найбольш прадуктыўныя з іх прэфіксацыя, суфіксацыя, прэфіксацыя + суфіксацыя, асноваскладанне, апакопа + асновасловаскладанне, словаскладанне.

*Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі РБ па дагаворы № 1410/2021.*

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Солахаў, А. В. Наватворы ў мове беларускай публіцыстыкі пачатку XXI ст. / А. В. Солахаў, Б. А. Крук. – Мазыр : МДПУ імя І. П. Шамякіна, 2021. – 160 с.

МГПУ им. И.П. Шамякина

## СОМАТИЧЕСКИЕ ФРАЗЕОЛОГИЗМЫ СО СЛОВОМ «СЮЛЭМ» В УДМУРТСКОМ ЯЗЫКЕ

**Бельтюкова Олеся (ФГБОУ ВО ГГПИ им. В. Г. Короленко, Россия)**
**Научный руководитель – Н. М. Люкина, канд. филол. наук**

У каждого народа в речи есть стилистические средства, которые являются строительным материалом языка. Фразеологизмы – это устойчивые выражения из двух и более слов, постоянные по структуре, составу и лексическому значению. Во фразеологическом фонде любого языка отражаются быт, обычаи, религиозные верования, поведение и нравственные ценности людей, т. е. фразеология связана с культурой речи каждого народа. Человек ощущает мир через органы чувств, разнообразные действия осуществляет при помощи рук, ног, головы. Фразеологизмы, связанные с частями тела и органами чувств, называются соматическими. Соматизмы составляют обширную группу фразеологических единиц (далее – ФЕ) языков.

В удмуртском языке глубокие исследования в области ФЕ были проведены Г. Н. Лесниковой в труде «Фразеология удмуртского языка», А. В. Егоровым в работе «Удмуртская соматическая фразеология (в сопоставлении с венгерской)» на основе «Краткого удмуртско-русского фразеологического словаря» (1967 г.) К. Н. Дзюиной.

В удмуртском языке мало работ, посвящённых отдельным соматическим фразеологизмам. В данной работе рассмотрены ФЕ, связанные со словом «сюлэм» (сердце). Через этот орган человек чувствует окружа-